## Міхась Балсун



**ВЫТОК**

Абсягі чачэрскага краю
Прапісаны ў сэрцы маім.
Бы птушка, сюды прылятаю
Ці холад, ці спёка стаіць.

Завуць Балсуны і Палессе* —
Жыццёвай дарогі выток,
Люляла тут сны мае песня —
Пяшчоты душэўнай глыток.

...Сцяжынка знаёмая ўецца.
Трава зноў у пацерках рос.
Нястрымана просіцца сэрца
У цішу бялюткіх бяроз.

Сустрэне грыбамі Лысуха,**
Сухі — вось дык назва! — Ручэй**
Мелодыі лесу паслухай —
Самоту прагоніш хутчэй.

Са сцежкі на ягаднік збочу —
Асінка лістотай махне,
Чарніц цёмна-сінія вочы
Спакусна зірнуць на мяне.



Дзяцінства ўспомніцца раптам, —
Не вернеш вясёлай пары, —
Лес клікаў нас ліпеньскім ранкам:
Гарлачык для ягад бяры.

Чародкай сяброўскай хадзілі,
Дужэла моц нашае крыл.
І разам з малою радзімай
Вялікую тут я адкрыў.

---

** Балсуны, Палессе — вёскі.*
*** Лысуха, Сухі Ручэй — назвы ўрочышчаў*

**АТОЖЫЛКІ СЛАВЯНСКАГА КАМЛЯ**

Крочу зноўку вуліцай Палесся.
Побач рэчка стужкаю бяжыць.
Тут на тры раёны льецца песня,
Бо яна не ведае мяжы.

Мкне на захад цераз лес і поле,
Дзе агні чачэрскія гараць.
Курс бярэ на поўнач — Краснаполле,
На ўсход — там Красная Гара.

Парадніла Беларусь з Расіяй
Нашых продкаў светлая зямля.
Мы ж, атожылкі пад небам сінім,
З аднаго, славянскага камля.

У баях былі заўсёды разам.
Дружбе нашай — доўгія вякі.
І цяпла душэўнага запасы,
Як сухар, дзялілі сябрукі.

Разгубіць пачуцці немагчыма,
Як не выпіць месяцу расу.
Я праз мытню ад сваёй Айчыны
Расіянам дружбу прынясу.

Як для птушак, так для сэрцаў нашых
Нельга ўвесці аніяк кардон.
Толькі разам мы вузлы развяжам,
Справімся з усякаю бядой.

## ПОЦІСК РУКІ

*Памяці Анатоля Грачанікава*

Лодку іншую гоніць быстрак,
І самотная чаіца тужыць,
Смерць адсекла яго магістраль,
Што пракладваў ён рупна ў душы.
Яго вершы — і радасць, і боль
Ад зямлі да вышынь паднябесся.
Абдымаў белы свет Анатоль
Думкай светлай, душою і песняй.
Верас зноўку блакітам цвіце,
У Шарпілаўцы пахне грыбамі.
Мне здаецца: паэт там ідзе
І бяседу вядзе з землякамі.
Адгукалі яго цягнікі,
Іх назад з далячыні не вернеш.
Праз гады грэе поціск рукі
І яго прамяністыя вершы.

## ПАДРАНКІ

Маё пакаленне — падранкі вайны,
Хоць шрамаў няма на іх целе,
Вярэдзяць душу неспакойныя сны,
У памяць мінулага цэляць.

Сняваў калыханку мне Паламскі лес
Пад трэск аўтаматаў у вёсцы.
Жыў страх у вачах учарашніх гарэз,
Слязамі цёк сок па бярозцы.

Нішчымніца мачыхай злоснай была,
На беднай трымала дыеце.
Надзённаю мараю вёска жыла,
Хавала, як скарб, лусту дзецям.



Мужнелі падлеткі за плугам, касой,
На крылы ўздымаліся рана,
Галоўны ўсё-ткі свой выйгралі бой —
Жыццё ацалела падранкаў.

## МАЯ РАКА

Я многія бачыў рэкі,
Мая ж рака — не з такіх,
Бо коціць на хвалях рэха
Трывожнае маці-ласіх.

На лузе дзяркач не змаўкае,
Крычыць:
— Годзе спаць,
— Годзе спаць.
Туман на ўзбярэжку блукае,
Начлегу не змог адшукаць...

Як неба ўспыхне на ўсходзе
І сонейка ў вір упадзе,
На бераг памыцца прыходзіць
Па травах няскошаных дзень.

## БАБУЛІ

На прызбе сонечнай бабулі
Чародкай шчыльнаю сядзяць, —
Малюнак звыклы сельскіх вуліц, —
Старыя любяць прыгадаць...

Гады прабеглі маладосці,
На скроні ўпаў густы туман,
Начамі ломіць немач косці,
Смыліць душа ад даўніх ран.

Лісты зжаўцелі пахаванак
На іх братоў на іх мужоў,
Ды чорны помніцца ўсе ранак:
Няўжо вайна і смерць няўжо?

Незаціханым яна болем
У іхняй памяці гудзе,
Калі ішлі з сярпом на поле
За пуставаты працадзень,

Калі выкошвалі лагчыны
І бралі бульбу напавер.
Для дзетак смак каржоў нішчымных
Быў лепш, чым «снікерсаў» цяпер.

Трывалі мужныя жанчыны,
Жыцця цягнулі цяжкі воз,
Іх твар парэзалі маршчыны,
Гадоў нанізан тоўсты стос.

...Сядзяць бабулі, век свой помняць,
Хоць час няўмольна так бяжыць!
Іх справы свецяцца, як промні
Крынічна чыстае душы.

**ҐРЫБНАЯ ПАРА**

Туман чапляецца за ногі
І падае ў сляды расой,
Да лесу крочу без дарогі,
Змывае ранак з твару сон.

Сінее ельнік за балотам,
А на грудках — мядзяны бор.
Душа імкне сюды з ахвотай,
У царства ціхае грыбоў.

Тут галасы без рэжысёра
Гучаць суладна дзень пры дні.
Тармозяць ногі самі скорасць,
Увага ўся — на мох, пад пні.

І не цішэюць лесу сцежкі
Аж да вячэрняе зары,



Дзе маскхалаты сыраежкі
За ноч накінулі ў бары.

Вось грыбнікі пад вобліск промняў
Лясную радасць паняслі...
І кожны ўпотайкі запомніць
Мясціны, дзе дары раслі.

**АСЕННІ МАТЫЎ**

Парк над Сожам
гарыць
кастром,
Зноў яго
запаліла восень.
Спрытна чырвань
апаўшых лістоў
Дворнікі
мётламі
косяць.
І на сцежках
растуць стажкі,
кожны з іх —
злітак звонкага
золата.
Як барцы перад боем
цяжкім
Распрануліся
клёны-волаты.